Дарагія сябры!

Міжнародны конкурс піяністаў «Мінск-2021» будзе праводзіцца з 1 па 10 снежня 2021 г. у Мінску.

## УМОВЫ ЎДЗЕЛУ

У конкурсе могуць удзельнічаць сольныя выканаўцы на фартэпіяна ва ўзросце ад 16 да 30 год уключна. Узрост канкурсантаў вызначаецца па стану на 1 снежня 2021 г. Дапускаецца ўдзел у конкурсе асобаў, якія ўдзельнічалі ў конкурсах "Мінск-2000", "Мінск-2005", "Мінск-2010", "Мінск-2014" (апроч уладальнікаў I прэмій).

**Адпраўленне заявак** на ўдзел ў конкурсе ажыццяўляецца **да 15 верасня 2021 г.** Дзень адсылкі дакументаў вызначаецца па даце іх паштовай адсылкі альбо па даце, пазначанай паштовым сервісам у электронным лісце.

Заяўкі накіроўваюцца анлайн на нашым сайце, на электронны адрас *piano.contest@philharmonic.by* альбо паштовым адпраўленнем па адрасе:

*Дырэкцыя Міжнароднага конкурсу піяністаў "Мінск–2021"*
*праспект Незалежнасці, 50, 220005*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, Белдзяржфілармонія*

Да заяўкі прыкладаюцца наступныя дакументы**:**

- копія дакумента, які падцвярджае асобу;
- дзве каляровыя фотаграфіі памерам 13*18 см альбо ў электронным выглядзе ў фармаце JPEG (не менш за 600 dpi);
- творчая біяграфія.

Заяўкі і дакументы падаюцца на рускай (беларускай) альбо ангельскай мовах. Заяўкі, пададзеныя пасля 15 верасня 2021 г. альбо з няпоўным пакетам дакументаў, не разглядаюцца.

## ФІНАНСАВЫЯ ЎМОВЫ

Для кожнага ўдзельніка конкурсу вызначаецца ўступны ўзнос. Яго аплата ажыццяўляецца ў беларускіх рублях ў памеры, эквівалентным *100 (сто) еўра* па курсу Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь на дзень аплаты. Узнос пералічваецца безнаяўным чынам на разліковы рахунак Белдзяржфілармоніі з пазначэннем прозвішча і ініцыялаў канкурсанта і назначэннем плацяжу "Арганізацыйны ўзнос".

*Рэквізіты для аплаты ўзносу:*

***Атрымальнік плацяжу:***
*Белдзяржфілармонія*
*Адрас: 220005 г. Мінск, пр-т. Незалежнасці, 50*
*УНП 100296574*
***Банкаўскія рэквізіты:***
*р/р BY50 AKBB 3015 0180 3001 5550 0000 у ЦБП №529 ААТ «АСБ Беларусбанк», БІК AKBBBY2X*
***Прызначэнне плацяжу:*** *арганізацыйны ўзнос з указаннем ініцыялаў і прозвішча канкурсанта.*

Дакумент, які падцвярджае аплату арганізацыйнага ўзносу, паказваецца канкурсантам падчас лёсавання.

Усе выдаткі знаходжання на конкурсе ажыццяўляюцца за кошт накіроўваючай арганізацыі альбо канкурсанта.

*Аргакамітэт і Дырэкцыя конкурсу не спрыяюць у набыцці беларускіх уязных візаў, браніраванні месцаў у гасцініцах для ўдзельнікаў і асобаў, якія суправаджаюць канкурсанта.

## ПАСЛЯДОЎНАСЦЬ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

Конкурсныя праслухоўванні складаюцца з трох тураў:

I і II туры адборачныя (адбудуцца ў Вялікай зале Беларускай акадэміі музыкі);

III тур (фінальны) пройдзе ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра ў Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Колькасць удзельнікаў II тура вызначаецца рашэннем журы, але не больш за 50% ад колькасці ўдзельнікаў I тура. Да фінальнага тура дапускаюцца не больш за 6 (шэсць) удзельнікаў II тура конкурсу.

Замена заяўленых у конкурснай праграме твораў не дазваляецца. Усе творы конкурснай праграмы выконваюцца на памяць. Конкурсныя праслухоўванні праводзяцца публічна. Паслядоўнасць выступленняў выяўляецца лёсаваннем і захоўваецца да канца конкурсу. Узнагарода пераможцаў і іншых канкурсантаў адбываецца ў апошні дзень правядзення конкурсу пры ўрачыстых абставінах, пасля чаго, на бязвыплатнай аснове , адбываецца канцэрт з удзелам усіх пераможцаў конкурсу.

## ПРАГРАМНЫЯ ПАТРАБАВАННІ

### I тур

Сольная праграма працягласцю не болей за 25 хвілін, якая складаецца з наступных твораў:

Адзін альбо некалькі твораў (апроч санат) Ё.Гайдна, І.Н.Гумеля, М.Клеменці, В.-А.Моцарта, Л.ван Бетховена, Ф.Шуберта (на выбар).

Два віртуозных эцюда на выбар з абавязковым выкананнем аднаго эцюда Ф.Шапэна (акрамя № 3 і №6 ор.10, № 7 ор. 25, № 1-3 ор. posth).

Твор беларускага кампазітара XIX–XXI стагоддзяў на выбар.

*Прыкладны пералік твораў беларускіх кампазітараў:*

- Абеліёвіч Леў. П’еса з цыкла “Фрэскі” (на выбар), 3 рамантычныя прэлюдыі
- Бельцюкоў Сяргей. Таката №1 ці Таката №2
- Багатыроў Анатоль. 2–3 прэлюдыі з цыкла “24 прэлюдыі”
- Вагнер Генрых. Танец-скерца, Тры капрычыо
- Глебаў Яўген. Фантастычныя танцы (на выбар)
- Глебаў Яўген – Алоўнікаў Ігар. “Беларускія сувеніры”, “Самба”
- Гарэлава Галіна. “Графіці”, “Рытмы вуліцы”, “Ціхая музыка для Роберта”
- Клумаў Аляксей. Беларуская танцавальная сюіта (частка на выбар)
- Кароткіна Ганна. “Легенда пра караля Стаха”
- Картэс Сяргей. Таката
- Кузняцоў Вячаслаў. “Бестыярыюм”, “Музыка для Юлі”
- Лучанок Ігар. Чатыры прэлюдыі
- Лыбін Дзмітрый. “Італьянскія ўспаміны пра Сяргея Пракоф’ева”, Таката і фуга на тэму Бартака
- Мдзівані Андрэй – Алоўнікаў Ігар. Сюіта з балета “Страсці” (на выбар)
- Алоўнікаў Уладзімір. Шэсць карцін (на выбар), “Запрашэнне да вальса”
- Орда Напалеон. Адзін з паланэзаў, вальс “Constellation”
- Падкавыраў Пётр. 24 прэлюдыі (на выбар)
- Смольскі Дзмітрый. Скерца, п’еса з цыкла “Гульня святла”, Прэлюдыі і фугі
- Тарасевіч Ян. “Песня кахання”, Сюіта №1 ці Сюіта №2, Беларуская фантазія
- Тырманд Эдзі. Таката, Сюіта “Чатыры настроі” (на выбар)

### II тур

Сольная праграма працягласцю не болей за 50 хвілін. Творы, выкананыя ў I туры, не могуць уваходзіць у праграму II тура.

### Фінальны тур

Канцэрт (рапсодыя) для фартэпіяна з аркестрам (на выбар)

- В.-А.Моцарт (К.414-595);
- Л. ван Бетховен – №1 До мажор, ор.15;
- Л. ван Бетховен – №2 Сі-бемоль мажор, ор.19;
- Л. ван Бетховен – №3 до мінор, ор.37;
- Л. ван Бетховен – №4 Соль мажор, ор.58;
- Л. ван Бетховен – №5 Мі-бемоль мажор, ор.73;
- Ф.Шапэн – №1 мі мінор, ор.11;
- Ф.Шапэн – №2 фа мінор, ор.21;
- Ф.Ліст – №1 Мі-бемоль мажор;
- Ф.Ліст – №2 Ля мажор;
- Р.Шуман – ля мінор, ор.54;

- Ё.Брамс – №1 рэ мінор,ор.15;
- Ё.Брамс – №2 Сі-бемоль мажор, ор.83;
- К.Сен-Санс – №2 соль мінор,ор.22;
- Э.Грыг – ля мінор, ор. 16;
- М.Равель – №1 Соль мажор;
- М.Равель – №2 Рэ мажор;
- П.Чайкоўскі – №1 сі-бемоль мінор, ор.23;
- П.Чайкоўскі – №2 Соль мажор, ор.44;
- С.Пракоф'еў – №1 Рэ-бемоль мажор, ор.10;
- С.Пракоф'еў – №2 соль мінор, ор.16;
- С.Пракоф'еў – №3 До мажор, ор.26;
- С.Рахманінаў – №1 фа-дыез мінор, ор.1;
- С.Рахманінаў – №2 до мінор, ор.18;
- С.Рахманінаў – №3 рэ мінор, ор.30;
- С.Рахманінаў – №4 соль мінор, ор.40;
- С.Рахманінаў – Рапсодыя на тэму Паганіні, ор.43;
- А.Скрабін – фа-дыез мінор, ор.20;
- Д.Шастаковіч – №1 ля мінор, ор.35;
- Д.Шастаковіч – №1 Фа мажор, ор.102;
- Дж.Гершвін – Рапсодыя ў блюзавых танах.

## КРЫТЭРЫІ АДЗНАКІ КАНКУРСАНТАЎ

Журы ацэньвае выкананне канкурсантаў па дзесяцібальнай сістэме па наступных крытэрыях:

- яскравасць выканальніцкай індывідуальнасці;
- дакладнасць перадачы стылістычных асаблівасцяў твораў, якія выконваюцца;
- мастацкая завершанасць выканання;
- асэнсаванасць, артыстычнасць і тэхніка выканання.

Канчатковае размеркаванне месцаў спраўджвае журы конкурсу адкрытым галасаваннем персанальна па кожным конкурсанце. Журы пакідае за сабой права прысуджваць не ўсе прэміі і дыпломы, а таксама падзяляць прэміі (апроч першай). Рашэнне журы канчатковае і не падлягае перагляду. Рашэнне журы аб'яўляецца ў апошні дзень конкурсу.

## ПРЭМІІ І ЎЗНАГАРОДЫ

Пераможцам конкурсу прысвойваюцца званні лаўрэата і ўсталёўваюцца грашовыя прэміі ў памеры, адпаведным:

І прэмія – 10 000 еўра
ІІ прэмія – 8 000 еўра
ІІІ прэмія – 5 000 еўра

Для ўдзельнікаў фінальнага тура конкурсу (выключаючы лаўрэатаў) прызначаюцца тры заахвочваючыя прэміі ў памеры 2 000 еўра кожная з прысваеннем звання дыпламанта конкурсу.

Усе прэміі ўручаюцца ў апошні дзень правядзення конкурсу ў беларускіх рублях па курсу Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. Прэміяльны фонд абкладаецца падаходным падаткам адпаведна дзеючага заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Па рашэнні журы для канкурсантаў і педагогаў могуць быць усталяваны іншыя ўзнагароды і граматы.

***Заявка**** | ***Application**** 
***на участие в*** | ***of the participation of the***
***Международном конкурсе пианистов «Минск- 2021»*** | ***International Piano Competition «Minsk-2021»***

1. Фамилия
*Family name*

---

2. Собственное имя
*First name*

---

3. Отчество (при его наличии)
*Patronymic (if exists)*

---

4. Дата и место рождения
*Date and place of birth*

---

5. Наименование и адрес учреждения образования (организации), в которой конкурсант обучается или работает
*Name and address of the establishment (organization) where the participant works or studies*

---

6. Место жительства (пребывания)
*Place of residence*

---

7. Телефон, адрес электронной почты (разборчиво, обязательно)
*E-mail, phone number (legibly, obligatory)*

---

9. Фамилия, собственное имя, отчество (при его наличии), почетное звание (при его наличии) педагогического работника (без сокращений)
*Educator's family name, first name, patronymic (if exists), title of honour (if exists) ( full-length)*

---

11. Конкурсная программа с продолжительностью звучания:
*Performance program with every piece duration*

I тур
I round

---

II тур
II round

---

Финальный тур
Final round

---

11. Творческие достижения
Creative achievements

---

______________________ | ______________________

(подпись участника) | (инициалы, фамилия)
*(participant's signature)* | *(initials, family name)*

___.___. 2021

* Заяўка прымаецца да разгляду пры запаўненні ўсіх пунктаў

* Заявка принимается к рассмотрению при заполнении всех пунктов

* *The application will be accepted for consideration if all items are filled*